# Гульнёвы практыкум для бацькоў
# *“Падарожжа ў краіну роднай мовы”*

*Навошта дзіцяці вывучаць родную мову?*

Самае дарагое ў жыцці – тое, што закладзена ў сэрца з ранніх год. Менавіта родная мова - сувязнае звяно ў далучэнні дзяцей да агульначалавечых каштоўнасцей, традыцый і гістарычнага мінулага нашай Радзімы. Маўленчае развіцце дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі адбываецца ў спецыфічнай сацыялінгвістычнай сітуацыі руска-беларускага блізкароднаснага двухмоўя (білінгвізму). Для большасці дзяцей першай мовай, на якой яны вучацца гаварыць і думаць, мець зносіны з акружаючымі іх людзьмі, з’яўляецца руская мова, а беларуская выступае для іх як другая. Дзеці мала чуюць родную мову ў шырокім ужытку, а таму маюць бедны слоўнікавы запас, іх маўленне знаходзіцца пад уплывам рускай мовы.

У сувязі з гэтым, сам час патрабуе звярнуцца да сваіх вытокаў, далучаць дзяцей да беларускай нацыянальнай культуры, паглыбляць знаемства з родным краем, беларускімі традыцыямі, фальклорам, прывіваць пачуцце грамадскасці, любоў да Радзімы.

**Паважаныя бацькі!**

Прапануем падарожжа ў краіну роднай мовы, што дапаможа Вам, а так сама нам, далучыць нашых дзяцей да беларускай мовы.

1. *“Глядзім па-беларуску”*. Пачніце з самага простага: з прагляду “Калыханкі”, з ранішніх праграм для дзяцей на “Беларусь-3”.

2. *“Спываем па-беларуску”*. Вывучыце з дзецьмі не толькі рускамоўныя песні, але і беларускія песенькі. Напрыклад: “Маленькай яліначцы холадна зімой”, пераклад усім знаёмай навагодняй песні, а таксама перакладзеныя песні з любімых мультфільмаў і г.д.

3. *“Малюем па-беларуску”*. Выкарыстоўвайце чатырохвершаваныя радкі і гульні пры маляванні. Напрыклад: «Кропка, кропка, побач – коска. Атрымаўся тварык просты. Ручкі, ножкі, агурочак - чалавек па свеце крочыць». Таксама малюнкам можна даваць беларускія назвы: «Яблынька», «Кветка», «Сонейка», «Вясёлка», «Мама, тата, я» і абмяркоўваць намаляванае на беларускай мове.

4. *“Гуляем па-беларуску”*. Гэта могуць быць знаёмыя гульні з перакладам слоў, напрыклад: «Раз, два, тры, чатыры, пяць. Я іду цябе шукаць». Навучыце па-беларуску чысціць зубы: «У мяне зубная шчотка, ёю зубы чышчу чотка! Хто не чысціць зубы шчоткай, вырасце бяззубай цёткай!». Падобнае можна знайсці у кнізе А.Хадановіча “Нататкі таткі”.

Гуляць можна на прагулцы ў лесе, што дае магчымасць замацоўваць вымаўленне гукаў. Напрыклад: "Зараз мы пойдзем на прагулку ў лес. Цудоўна там, вось толькі камары перашкаджаюць. Лётаюць вакол цябе і звіняць: з-з-з-з-з-з… Як яны звіняць? (З-з-з-з…)

– Галінкамі адгонім камароў і пойдзем далей. А навокал шмат прыгожых кветак! Пчолы лётаюць, збіраюць мёд і размаўляюць паміж сабой: ж-ж-ж-ж… Як яны размаўляюць? (Ж-ж-ж-ж…)".

Цікава можна праводзіць час на кухні, а таксама замацоўваць уменне правільна ўтвараць новыя беларускія словы. Гэта можа быць *гульня "Куды што пакладзём?"* "Мама прыйшла з крамы і раскладае прадукты. Дапамажы ёй раскласці прадукты. Куды мы пакладзем хлеб? Хлеб мы пакладзём ……у хлебніцу, цукар? у … (цукарніцу), цукеркі? у……(цукерніцу), сухары? у…. (сухарніцу), соль? … (сальніцу)."

5. "*Размаўляем па-беларуску"*. Кожны дзень можна абмяркоўваць з дзецьмі падзеі дня: "Як прайшоў дзень у дзіцячым садку", "Што новага бачылі на прагулцы", "Якую новую кнігу сёння чыталі?" і г.д. А яшчэ можна падпісаць прадметы, якія акружаюць дзяцей у іх пакоі на беларускай мове і кожны дзень замацоўваць іх назвы.

6. *"Чытаем па-беларуску"*.Чытайце з дзецьмі як мага больш, а галоўнае – прагаворвайце тое, што прачыталі!

7. *"Парады для бацькоў: Як пачаць размаўляць па-беларуску"*

Пазбаўцеся страхаў.

*Папаўняйце свой слоўнікавы запас*.

Пачніце з пасіўных спосабаў: чытайце кнігі, глядзіце агучаныя па-беларуску фільмы, слухайце беларускамоўную музыку, чытайце беларускамоўныя сайты і газеты, усталюйце на кампутары праграмы з беларускім інтэрфейсам. На сайтах, дзе гэта магчыма, пераключайцеся на беларускую мову. Тое самае – з банкаматамі, інфакіёскамі і г.д.

*Пішыце па-беларуску*

Калі вам складана пачаць размаўляць – пачніце з пісьмовай мовы. Мэйлы, эсэмэскі, паведамленні ў інтэрнэце, допісы ў сацсетках. Пры гэтым вы маеце час абдумаць напісанае, зазірнуць у слоўнік. Вашыя знаёмыя пачнуць звыкацца да вас беларускамоўнага, а вы знойдзеце новых беларускамоўных знаёмых.

*Звяртайцеся па-беларуску да незнаёмцаў*

*Пачніце ўжываць мову ў побыце*

Для таго, каб пачаць не толькі размаўляць, але і думаць, сніць сны па-беларуску, вам спатрэбіцца час. Але мэта таго вартая, бо разам з мовою вам адкрыецца ўнікальны беларускі сусвет!